■ Надвор'е

# СПЯКОТА ЗАШКАЛЬВАЕ

## У выхадныя чакаецца да 34 цяпла

**Ліпень у Беларусі амаль з першых дзён паказвае, што менавіта ён з'яўляецца самым гарачым месяцам года. Вось і ў найбліжэйшыя дні нас чакае анамальная спякота. Спецыялісты Белгідраметцэнтра паведамляюць, што ў выхадныя надвор'е ў краіне будзе вызначаць антыцыклон, які сфарміраваны ў цёплай паветранай масе.**

Таму ў суботу і нядзелю ападкаў увогуле не чакаецца, а тэмпература паветра пачне павялічвацца. Уначы прагназуецца плюс 12-18 градусаў, а ўдзень стане прыпякаць да 28-34 цяпла. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першыя дні наступнага тыдня стане яшчэ гарачэй. У панядзелак надвор'е на большай частцы тэрыторыі краіны будуць вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску і трапічныя паветраныя масы, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. Пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па паўночным захадзе пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 13-20 цяпла, удзень — плюс 28-34 градусы, а месцамі — нават да 35-36 цяпла. Толькі ў Віцебскай вобласці ў гэты дзень прагназуецца да плюс 25-27 градусаў.

Ужо традыцыйна сіноптыкі нагадваюць нам, што пры такім сухім і гарачым надвор'і ў краіне захоўваецца складанае пажаранебяспечнае становішча. У сувязі з гэтым спецыялісты раяць не забывацца пра асцярожнае абыходжанне з агнём і з разуменнем ставіцца да забароны наведвання лясоў і развядзення вогнішчаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія — 2015

# Колькасць стабальнікаў павялічылася больш чым удвая

**Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў не спяшаецца ў гэтым годзе з абвяшчэннем вынікаў аналізу праверкі работ удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Менш чым за тыдзень да пачатку прыёму дакументаў у ВНУ невядома, колькі абітурыентаў не пераадолелі ўстаноўлены мінімальны парог і не змогуць удзельнічаць у прыёмнай кампаніі. Нагадаем, што ў гэтым годзе мінімальныя парогі ўстаноўлены для першай і другой профільнай дысцыпліны, таму падлікі ўскладняюцца. Не абвяшчаецца і інфармацыя пра абітурыентаў, якія атрымалі максімальныя балы па тых ці іншых прадметах.**

У прэс-службе Міністэрства адукацыі паведамілі, што яшчэ не правераны работы ўдзельнікаў ЦТ па дзвюх дысцыплінах плюс работы абітурыентаў, якія здавалі ЦТ у рэзервовы дзень (2 ліпеня). Але ўжо зразумела, што колькасць уладальнікаў стабальных сертыфікатаў будзе сёлета большай, чым летась. На сёння ёсць ужо 277 стабальных вынікаў. У мінулым годзе па ўсіх дысцыплінах 100 балаў выстаўляліся 122 разы.

Вядома таксама, што на ЦТ па матэматыцы 100 балаў атрымалі 89 чалавек, а на ЦТ па рускай мове — 83 чалавекі. У 2014 годзе максімальныя балы на матэматыцы здолелі набраць усяго 16 удзельнікаў экзамену, а па рускай мове — 25 чалавек.

Былі летась таксама і тры ўладальнікі двух стабальных сертыфікатаў. Ці будуць у гэтым годзе такія бліскучыя вынікі? У Міністэрстве адукацыі абяцаюць, што больш поўны аналіз ЦТ будзе зроблены толькі праз тыдзень...

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Крэдытная ракіроўка

# З ВАЛЮТЫ — У РУБЛІ

**Рэшткі крэдытаў у замежнай валюце фізічным асобам цяпер можна выплочваць у беларускіх рублях. Такую магчымасць сваім кліентам прадаставіў Беларусбанк.**

Рашэнне аб магчымасці пагашэння насельніцтвам валютных крэдытаў у рублях прынята дзеля таго, каб знізіць нагрузку на грамадзян пры пагашэнні такіх пазык. У дэпартаменце крэдытавання насельніцтва Беларусбанка нам патлумачылі, што магчымасць такой «ракіроўкі» тычыцца ўсіх відаў крэдытаў, у тым ліку спажывецкіх і выдадзеных на будаўніцтва і набыццё нерухомасці. У прэс-службе банка таксама паведамілі, што найбуйнейшай банкаўскай установе людзі сёння вяртаюць каля 5 тысяч крэдытаў у замежнай валюце. Большасць з іх была ўзята на фінансаванне нерухомасці. З 2009 года выдача валютных крэдытаў не ажыццяўляецца, таму практычна ўсе спажывецкія крэдыты ў доларах і еўра ўжо пагашаны.

**Намеснік дырэктара дэпартамента крэдытавання насельніцтва Беларусбанка Святлана ФІЛІПЧУК** патлумачыла, што пераводзіць запазычанасць у рублі будуць па курсе продажу замежнай валюты, які дзейнічае для правядзення аперацый пры выкарыстанні банкаўскіх плацежных картак банка. Зразумела, што зменяцца ў гэтым выпадку і памеры працэнтаў па крэдыце. Пасля пераводу валютных крэдытаў у рублёвыя працэнтная стаўка па крэдытах на нерухомасць складзе 35% гадавых, па спажывецкіх крэдытах — 43% гадавых. Канчатковыя тэрміны пагашэння крэдытаў застануцца ранейшымі.

Існуе ў банка і пэўны алгарытм пераводу крэдытаў. Па-першае, кліенту трэба звярнуцца з заявай менавіта ў тое аддзяленне банка, дзе ён раней атрымліваў крэдыт. Там крэдытаатрымальніку і яго паручыцелям (калі яны ёсць) неабходна будзе прадаставіць у банк дакументы, якія пацвярджаюць даходы. Як правіла, гэта даведка аб даходах з месца працы. Пасля гэтага банк ацэньвае крэдытаздольнасць крэдытаатрымальніка (паручыцеля) і афармляе дадатковае пагадненне да крэдытнага дагавора з указаннем запазычанасці ў беларускіх рублях. Акрамя таго, разам з пераводам крэдыту ў рублёвую зону крэдытаатрымальніку банк дае дадатковы бонус: цяпер у таго з'явіцца магчымасць пагасіць крэдыт датэрмінова з аплатай працэнтаў за фактычны час карыстання крэдытам.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Замежны шопінг

# Трэба будзе плаціць дадатковы збор?

## Нацбанк вывучыць магчымасць такога спагнання пры куплі фізасобамі тавараў з-за мяжы праз інтэрнэт

**Пасля гэтага адпаведныя прапановы будуць накіраваны ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Гэта вынікае з каментарыя ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка адносна ліста, разасланага днямі рэгулятарам камерцыйным банкам.**

У лісце (копія якога ёсць у БЕЛТА) банкам прапанавана да 6 ліпеня выказаць меркаванні аб магчымасці і мэтазгоднасці збірання дадатковага збору на этапе аплаты тавараў з выкарыстаннем банкаўскай аплатнай карткі ў сетцы інтэрнэт. Таксама агучана просьба прыняць да ўвагі наяўнасць у банка магчымасці падзелу плацяжоў у інтэрнэце па іх відах, сённяшнія спосабы аплаты ў глабальнай сетцы, міжнародную практыку выкарыстання дадатковых збораў і абмежаванняў пры куплі тавараў праз інтэрнэт.

«Нацыянальны банк заўсёды імкнецца аператыўна рэагаваць на ініцыятывы і прапановы, якія з'яўляюцца ў грамадстве, органах дзяржкіравання па аспектах, што закранаюць дзейнасць рэгулятара і банкаўскай сістэмы ўвогуле. Пры гэтым для фарміравання аргументаванага меркавання па тым ці іншым пытанні яго неабходна найперш усебакова вывучыць», — сказалі ў галоўным банку краіны. Нядаўна прапанову спаганяць падатак з пакупак беларускіх грамадзян у замежных інтэрнэт-крамах выказаў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.

**Андрэй БЫКАЎ**

■ Фестывалім!

# НА КУПАЛЛЕ Ў АЛЕКСАНДРЫІ ЧАКАЮЦЬ 70 ТЫСЯЧ ГАСЦЕЙ

**Сёння ў Шклоўскім раёне пачынае працаваць вялікі купальскі кірмаш з канцэртамі і забаўляльнымі мерапрыемствамі шостага фестывалю «Александрыя збірае сяброў».**

Лепшага адпачынку ў спякотны дзень, як на беразе Дняпра, ад якога вее прыемнай прахалодай, і не прыдумаеш. Тым больш што сёлетні фестываль як ніколі насычаны мноствам розных падзей.

— На яго прыедуць звыш 2000 прафесійных і самадзейных артыстаў, майстроў і рамеснікаў, — паведаміў **начальнік упраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Анатоль СІНКАВЕЦ**. — Шмат удзельнікаў прыбудзе з Расіі і Украіны.

Купальскае свята ў Александрыі з кожным годам становіцца ўсё больш цікавым для іншых краін. Прычым не толькі для творчых калектываў.

— У мерапрыемстве прымаюць удзел дыпламаты 32 краін, якія перад тым, як наведаць Александрыйскі кірмаш, пабываюць у Бабруйску і пазнаёмяцца з яго прамысловым патэнцыялам, паглядзяць аграсядзібы Магілёўскай вобласці, наогул ацэняць турыстычныя магчымасці нашага рэгіёна, — адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА**.

Вельмі разнастайная культурная праграма фестывалю. Будзе працаваць вялікая маладзёжная пляцоўка. Сёння тут пройдзе конкурс «Уладар сяла», у якім прымуць удзел маладыя сем'і з усёй Магілёўскай вобласці. Можна будзе паназіраць, з якой спрытнасцю яны пілуюць дровы, гатуюць ежу, вядуць гаспадарку і нават спяваюць песні. Запланавана работа выставачнай тэматычнай экспазіцыі маладзёжных праектаў «Нашы ідэі табе, Беларусь», якая прадставіць працу чатырох пляцовак пад эгідай рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі»: «Навука Аграрная», «Навука Універсітэцкая», «Будаўніцтва. Навука. Тэхніка» і « Інтэрактыўная маладзёжная пляцоўка». Маладыя вынаходнікі і навукоўцы паведамяць, як атрымаць электрычную энергію за кошт плыні вады ў рацэ, параяць, як знайсці свой стыль, і нават падкажуць, як пабываць у іншай рэальнасці.

Александрыйскі фэст будзе доўжыцца два дні амаль без перапынку. Пасля мюзікла «Папараць-кветка» з удзелам расійскіх зорак — Кацярыны Шаўрынай і Ігара Карнелюка — адбудзецца святочны феерверк, потым да 3 гадзін раніцы будзе працаваць маладзёжная дыскатэка. Натхняць удзельнікаў будуць папулярныя беларускія дыджэі і групы «MBAND» з Расіі і «Дынама» з Украіны. У нядзелю працягнуць працаваць выставачныя і гандлёвыя пляцоўкі, адбудзецца канцэрт Кацярыны Шаўрынай і Ігара Карнелюка.

Арганізатары чакаюць, што фестываль наведае каля 70 тысяч чалавек. Для іх будуць працаваць выязныя кавярні, дзе можна будзе пакаштаваць розныя прысмакі.

Да месца падзей можна дабрацца чыгуначным, грамадскім аўтамабільным, а таксама асабістым транспартам. Беларуская чыгунка прызначыла на 4-5 ліпеня дадатковыя цягнікі рэгіянальных ліній эканомкласа, якія будуць курсіраваць па маршруце Магілёў — Шклоў — Копысь (Александрыя) — Шклоў — Магілёў і Орша — Копысь (Александрыя) — Орша. У нядзелю апошні дадатковы цягнік з Копысі адправіцца ў Магілёў у 3.30 ночы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

*Усё прыйшло часова*
*ў гэты свет*
*І адплыве аднойчы*
*з вечнай плынню.*
*Калі стагоддзі*
*змыюць з камню след —*
*Не забывайце тых,*
*хто след пакінуў.*

*Не забывайце*
*іх апошні бой,*
*Дзе смерць дала*
*ўсім свае імёны...*
*Прад Вечнасцю*
*адзін раўняюць строй*
*Салдат вядомы*
*побач з невядомым.*

Фота слова Яўгена ПЯСЕЦКАГА







Не ўсе імёны ўдзельнікаў вайны дайшлі да нас праз вогненнае ліхалецце. Але, нават калі чыесьці прозвішчы і сёння застаюцца невядомымі, мы ведаем іх агульнае імя: героі.

Мінчанін Віктар Талмачоў — беражліва захоўвае ўсё, што нагадвае пра яго бацьку, лейтэнанта Пятра Талмачова. Ваенны лётчык загінуў летам 1942 года далёка ад беларускай зямлі. Яго апошні бой стаў адным з многіх, якія набліжалі Перамогу. Віктар Талмачоў з партрэтам свайго бацькі сустрэўся мне каля Вечнага агню на мінскай плошчы Перамогі.

Ад гэтай плошчы па праспекце Незалежнасці блізка да месца, дзе я зрабіў наступны фотаздымак. Гэты помнік — адзін з самых невялікіх у сталіцы, але вельмі значны для нашай памяці. На гранітнай пліце сімвалічна перададзены апошнія сляды: адбіткі пакінулі тыя, хто выйшаў змагацца супраць захопнікаў. На гэтым месцы акупанты каралі смерцю вядомых і невядомых сёння патрыётаў.

■ Транспарт

# З ПОЎНАЧЫ НА ПОЎДЗЕНЬ

## Першыя станцыі новай лініі метро запрацуюць ужо праз тры гады

**Аб гэтым паведаміў начальнік дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Павел ЦАРУН. Спецыяліст адразу нагадаў, што ўсяго на трэцяй лініі метро плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 14 станцый ад Зялёнага Луга да Курасоўшчыны, плюс тры перасадачныя вузлы. Працягласць лініі складзе больш за 17 кіламетраў.**

### ПЕРШЫ ПУСКАВЫ КОМПЛЕКС УЖО БУДУЕЦЦА

У першую чаргу будаўніцтва ўвойдуць сем станцый, а ў пачатковы пускавы комплекс — чатыры. Тэрміны ўводу апошніх удакладняюцца, але арыенціровачна іх плануюць пабудаваць напрыканцы 2018-га ці ў пачатку 2019 года. Работы па праектаванні і будаўніцтве лініі ўжо пачаліся. Першымі запланавана пабудаваць станцыі «Кавальская Слабада», «Вакзальная», «Плошча Багушэвіча» і «Юбілейная плошча». А таксама інжынерны корпус і будынак абслуговага персаналу.

Павел Царун адзначыў, што ў складзе першага комплексу будуць пабудаваны два перасадачныя вузлы метрапалітэна: першы — са станцыі «Плошча Леніна» на «Вакзальную», другі — са станцыі «Плошча Юбілейная» на «Фрунзенскую». Сталічныя транспартнікі ўпэўнены, што гэта дазволіць істотна разгрузіць вельмі ажыўлены вузел «Купалаўская» — «Кастрычніцкая». Будаўнічая працягласць першага комплексу складзе 4,3 кіламетра, а эксплуатацыйная — 3,3 кіламетра.

### ВЕСТЫБЮЛЬ «ВАКЗАЛЬНАЙ» ВЫЙДЗЕ НА ПАВЕРХНЮ

Транспартнікамі сёння ажыццяўляецца перакладка інжынерных сетак на пляцоўцы будаўніцтва злучальнай веткі паміж другой і трэцяй лініямі Мінскага метрапалітэна, якая арыенціровачна праходзіць ад скрыжавання вуліц К. Цэткін — Кальварыйская да скрыжавання праспект Дзяржынскага — вуліца К. Цэткін. Даўжыня гэтай веткі складае каля 900 метраў. Завяршаецца перакладванне інжынерных сетак у раёне будучых станцый метро «Кавальская Слабада» і «Вакзальная», пачалося будаўніцтва першага і другога аб'ездаў непасрэдна для станцыйнага комплексу «Кавальская Слабада». А вось перакладка інжынерных сетак на тэрыторыі будучай станцыі «Юбілейная плошча» патрабуе ў далейшым частковага закрыцця вуліц Караля і Сухой. Упершыню на станцыі «Вакзальная» будзе пабудаваны наземны вестыбюль.

### ТРАВАЛАТАРЫ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫ СТЫЛЬ

Трэцяя лінія Мінскага метро будзе максімальна аўтаматызавана, упэўнены кіраўнік будаўніцтва падземкі. Пры руху цягнікоў за машыністам застануцца толькі кантрольныя функцыі. Плануецца ўкараніць сучасныя сістэмы бяспекі, відэаназірання, безбар'ернага асяроддзя і кіравання тэхналагічным абсталяваннем. На новых станцыях усталююць травалатары (эскалатары без прыступак), як у аэрапортах. На станцыях таксама прадугледжана ўстаноўка ахоўнага экрана, што засцеражэ пасажыраў ад выпадковага ці наўмыснага падзення на рэйкі. Кожная станцыя будзе мець свой арыгінальны стыль.

### БУДУЕМ ПА ГРАФІКУ

Сёлета на будаўніцтва аб'ектаў першага пускавога комплексу трэцяй лініі метрапалітэна выдзелена інвестыцыйнай праграмай Мінска 969,9 млрд рублёў. Акрамя бюджэтных рэсурсаў горада, для будаўніцтва былі прыцягнуты і крэдыты Банка развіцця ў памеры 500 млрд рублёў.

Спецыяліст паведаміў, што цяпер на аб'екце працуюць каля 400 чалавек. Пры раскрыцці фронту работ да будаўніцтва будуць прыцягнуты супрацоўнікі аб'яднання «Мінскбуд». «Сёння тэмпы будаўніцтва трэцяй лініі метрапалітэна ў асноўным вытрымліваюцца», — сказаў Павел Царун.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ЦЯГНІК З НАШАГА ДЗЯЦІНСТВА

## Дзіцячая чыгунка святкуе свой 60-ты сезон

**У ліпені ў Мінску запланаваны шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да 60-гадовага юбілею Дзіцячай чыгункі імя К.С. Заслонава Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі. Святочная дата прыпадае на 9 ліпеня. Самі чыгуначнікі лічаць яе знакавай, паколькі менавіта тут, на Дзіцячай чыгунцы, многія з іх яшчэ школьнікамі вызначыліся з будучай прафесіяй і выбралі свой жыццёвы шлях.**

Дзіцячая чыгунка сёння — гэта першая прыступка прафесійнага карпаратыўнага навучання, якую дзеці праходзяць, займаючыся ў гуртку «Юны чыгуначнік». У маі 2009 года быў адкрыты новы вучэбны цэнтр з профільнымі класамі і камп'ютарным кабінетам. За час працы цэнтра навучанне ў ім прайшлі больш за тры тысячы школьнікаў. Штогод выпускнікамі Дзіцячай чыгункі становяцца каля 40 юнакоў і дзяўчат. За гэты перыяд больш за 80 юных чыгуначнікаў паступілі ў адпаведныя навучальныя ўстановы.

Мерапрыемствы, прысвечаныя 60-годдзю Дзіцячай чыгункі, будуць праводзіцца да канца года. Так, у жніўні пройдзе выстава чыгуначнага мадэлявання. У верасні Мінскае аддзяленне разам з Беларускім прафсаюзам чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў плануе правесці фотаконкурс, прысвечаны гэтаму юбілею. У снежні будзе арганізаваны «Навагодні экспрэс».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



Юная праваднiца Чэслава МІЛЬГУЙ ужо два гады на Дзіцячай чыгунцы і ў наступным годзе збіраецца паступаць у каледж на спецыяльнасць «Праваднік».



Лепшыя сябры Антон КАРОЛЬ і Павел ЮШКО чатыры гады таму разам прыйшлі на чыгунку. Яны ўжо заслужылі ганаровыя званні намеснікаў начальніка змены.

**Дарэчы**

**Цягнік Дзіцячай чыгункі «Сталічны экспрэс» у летнім сезоне 2015 года будзе курсіраваць:**

**летам** — па серадах, чацвяргах і пятніцах з 11.00 да 14.00, а па суботах і нядзелях — з 11.00 да 16.40;

**у верасні** — па суботах і нядзелях з 11.00 да 16.40.





Начальнікі цягніка Кірыл ІВАНОЎ і Раман МУСТАФАЕЎ правяраюць цягнік і гатоўнасць падначаленых перад кожным адпраўленнем.

■ Мы памятаем!

# МОЙ ФІЛЬМ ПРА ВАЙНУ

**Не так даўно на стыку кіно і літаратуры нарадзілася новая форма самавыяўлення — буктрэйлеры, асабліва папулярная ў моладзі. Гэта своеасаблівыя відэаанатацыі да кніг, якія выклікаюць у гледача зацікаўленасць літаратурным творам.**

Мінскі гарадскі камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прапанаваў юнакам і дзяўчатам праявіць сябе ў майстэрстве стварэння такіх ролікаў паводле сваіх любімых твораў пра вайну. Днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы падводзілі вынікі рэжысёрскай працы моладзі. Дарэчы, з усімі ролікамі ўдзельнікаў можна пазнаёміцца ў групе «Мой фільм пра вайну» ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте», бо, як вядома, лепш аднойчы пабачыць, чым сто разоў пачуць.

Без сумнення, у кожным з ролікаў адчуваецца аўтарскае «я», свой погляд на тое, як зацікавіць чытача творамі ваеннай тэматыкі. Нехта карыстаўся ўрыўкамі з вядомых кінастужак, спрабуючы «ўзяць» спецэфектамі, нехта сам «экранізаваў» найбольш вядомыя сцэны з кніг, а хтосьці падыходзіў да справы лаканічна (але не значыць — няякасна!) і проста зачытваў урыўкі з твораў, выкарыстоўваючы ў якасці фону гістарычныя фотаздымкі.

Усяго ў конкурсе прынялі ўдзел больш як 200 чалавек са 127 ролікамі. На фінал з'ехаліся аўтары найлепшых відэа: школьнікі, студэнты і маладыя спецыялісты, якія здымалі буктрэйлеры. Як распавялі арганізатары, найбольшую ўвагу атрымалі такія аўтары, як Васіль Быкаў, Алесь Адамовіч, Міхаіл Шолахаў.

— Наш конкурс у пэўным сэнсе інавацыйны, — зазначыў падчас мерапрыемства **першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Юрый ЧАЧУКЕВІЧ.** — Яго старт быў дадзены ў лютым, і вось цяпер мы сабраліся, каб адзначыць найлепшых. Мы вельмі часта гаворым пра мадэрнізацыю, маючы на ўвазе беларускую эканоміку, але, на нашу думку, яна павінна закрануць і сферу патрыятычнага выхавання. Такія конкурсы, як гэты, дапамогуць нам рухацца наперад.

— Нам было вельмі цікава папрацаваць у такім незвычайным фармаце, — распавяла **Ганна АЛЯШКЕВІЧ, студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта**, якая разам з сяброўкамі зняла ролік паводле кнігі Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча». — На выбар твора, магчыма, паўплывала тое, што МДЛУ традыцыйна з'яўляецца «дзявочай» ВНУ, таму нас хвалявала тая праблема, якую ўзняла аўтар. І мы шчыра лічым, што жанчынам на вайне трэба было праяўляць яшчэ большую мужнасць, чым салдатам-мужчынам. У гэтым і заключаецца галоўная ідэя нашага роліка.

Пасля ўзнагароджання пераможцаў Юрый Чачукевіч перадаў кампакт-дыск з усімі ролікамі на захаванне ў Нацыянальную бібліятэку, а таксама паабяцаў, што ў хуткім часе будзе аб'яўлены новы конкурс буктрэйлераў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# МЕСЦА СУСТРЭЧЫ: ДЫЯЛОГ

## Аднайменная гуманітарная праграма дапамагае ахвярам нацызму ў краіне

**Каля 18 мільёнаў людзей — ваеннапалонныя, вязні канцлагераў і простае грамадзянскае насельніцтва ў Германіі і на акупаваных ёй тэрыторыях былі вымушаны займацца прымусовай працай у ваеннае ліхалецце. Да нашых дзён дажыло ўжо вельмі мала сведкаў тых падзей. А людзям такога ўзросту, асабліва калі яны адзінокія, ужо цяжка самастойна весці хатнюю гаспадарку. Патрэбна ім і маральная дапамога. Ды і здароўе ўжо не найлепшае.**

— Ад 2008 года ў краіне працуе гуманітарная праграма «Месца сустрэчы: дыялог», якую ініцыяваў і фінансуе нямецкі фонд «Памяць, адказнасць і будучыня». А ў Беларусі яе каардынуе Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Узаемаразуменне», — гаворыць **старшыня яго праўлення Анжаліка АНОШКА**. — Праграма фонду скіравана на павышэнне жыццёвага ўзроўню і ўдзелу ў грамадскім жыцці ахвяр гітлераўскага рэжыму, якія дажылі да нашых дзён. У першую чаргу яна разлічана на былых вязняў нацысцкіх канцэнтрацыйных лагераў.

Па дзяцінстве Галіны Рыбцовай, якая каардынуе адзін з праектаў праграмы ў Магілёве, ваенны каток праехаўся бязлітасна. У 1943-м яе разам з маці забралі ў лагер за тое, што бацька ваяваў супраць немцаў дзесьці на фронце. Дачка і маці прайшлі праз лагеры ў Оршы, Талачыне, а пасля трапілі ў Асвенцым. Уратаваліся толькі таму, што іх купілі, каб працавалі ў маёнтку нямецкага генерала непадалёк ад Брандэнбурга.

— У нас ёсць праграма «Пажылы пажылому», — расказвае Галіна Іванаўна. — Людзі сталага веку, сярод якіх і колішнія вязні канцлагераў, прыглядаюць за тымі, хто, на жаль, ужо самастойна весці гаспадарку не можа. Дапамагаюць нам і маладыя валанцёры. Працуюць кулінарны гурток і фіта–кавярня. Ёсць нават хор ветэранаў «Родныя напевы». І старыя людзі, якія перажылі ваеннае ліхалецце, вельмі шануюць гэтыя стасункі, дзякуючы якім яны не застаюцца сам-насам са сваімі праблемамі. Вось толькі іх становіцца ўсё менш і менш, напрыклад тых, што перацярпелі блакаду або трапілі ў ваенны палон, засталося толькі пяць чалавек...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*